## *Жыццё і творчасць Васіля Быкава*

Васіль Быкаў – беларускі празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч. У сучаснай беларускай літаратуры першы адкрываў свету праўду пра Другую сусветную вайну і яе наступствы. У сваіх творах уздымаў экзістэнцыяльныя праблемы маральнага выбару. Сваіх герояў ставіў у сітуацыях найвялікшых выпрабаванняў паміж жыццём і смерцю. У часы перабудовы В. Быкаў натхнёна працаваў на ніве аднаўлення нацыянальнай культуры. Ён, як мала хто з сучаснікаў, усведамляў і спрабаваў данесці іншым, што выхад Рэспублікі Беларусь са складу СССР і абвяшчэнне яе незалежнасці можа быць штуршком да беларускага нацыянальнага адраджэння.

Творчасць Быкава адрознівалася ад яго папярэднікаў. Ніхто да Быкава не пісаў пра вайну так рэалістычна і праўдзіва. У яго творах адсутнічае маштабнасць і пампезнасць, а ў цэнтры найчасцей знаходзіцца звычайны чалавек або радавы салдат, пастаўлены ў сітуацыю надзвычайнага эмацыйнага напружання. У кожным сваім героі пісьменнік шукаў непаўторную асобу, з усімі прыземленымі пачуццямі і інстынктам самазахавання.

Нарадзіўся Васіль Быкаў 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыўшы школу, паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча, аднак праз пагаршэнне матэрыяльнага становішча і адмену дзяржаўнай стыпендыі вымушаны быў пакінуць вучобу. У пачатку Другой сусветнай вайны ў складзе інжынернага батальёна ўдзельнічаў у будаўніцтве абаронных збудаванняў. Скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча і з 1943 года ў якасці камандзіра ўзвода аўтаматчыкаў, а таксама ўзвода палкавой і армейскай артылерыі ўдзельнічаў у баях. Пасля дэмабілізацыі працаваў у рэдакцыі абласной газеты „Гродзенская праўда". Быў сакратаром гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1978 годзе пераехаў у Мінск. З гэтага часу займаўся выключна творчай працай. У 1990 годзе быў абраны прэзідэнтам Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына", займаў гэтую пасаду да 1993 года. Быў прэзідэнтам Беларускага ПЭН-Цэнтра. З 1998 па 2002 гг. жыў у эміграцыі. Памёр 22 чэрвеня 2003 года ў Мінску.

Вайна моцна паўплывала на творчасць Васіля Быкава. Пачаткам сваёй літаратурнай дзейнасці пісьменнік лічыў апавяданні „Смерць чалавека" і „Абознік", напісаныя ў 1951 годзе і апублікаваныя ў 1957. Галоўныя тэмы, якія прысутнічаюць у творах Васіля Быкава, – гэта чалавек на вайне, маральны выбар, чалавечая годнасць. Паводле Быкава, пра вайну можна пісаць толькі „вычарпальную праўду". Магчыма,

пісьменнік лічыў, што прадстаўлены ў ягоных творах рэалізм будзе напамінам і перасцярогай для будучых пакаленняў: „Вайна – піша Быкаў – супярэчыць чалавечай прыродзе, ніщто не можа апраўдаць яе існавання… Але вайна амаральна і таму, што яна здольная паламаць чалавека духоўна”[1].

У пазнейшы перыяд сваёй творчасці, перадусім на старонках публіцыстычных выданняў, Васіль Быкаў актыўна заклікаў да вяртання краіны да дэмакратычных каштоўнасцей і да звароту да нацыянальных каранёў, рэабілітацыі выкрасленых з гісторыі імёнаў, публікацыі забароненых кніг, наданні беларускай мове статусу дзяржаўнай.

Сярод найбольш вядомых твораў – аповесці і апавяданні: „Жураўліны крык” (1960), „Трэцяя ракета” (1962), „Альпійская балада” (1963), „Мёртвым не баліць” (1965), „Знак бяды” (1982), „Сцюжа” ды інш.

Для больш поўнага знаёмства з жыццём і творчасцю Васіля Быкава рэкамендуем пазнаёміцца з наступнымі публікацыямі:


1. Васіль Быкаў, *Доўгая дарога дадому, https://knihi.com/Vasil_Bykau/Douhaja_daroha_dadomu.html*
2. Міхась Тычына, *Пад знакам Быкава* [online] https://knihi.com/Michas_Tycyna/Pad_znakam_Bykava.html
3. *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя*, пад рэд. У. Гніламёдава і В. Жураўлёва, т. 3, Мінск 2002, сс. 640-688.
4. Валерый Максімовіч, *Творчасць Васіля Быкава ў экзістэнцыяльным вымярэнні*, „Białorutenistyka Białostocka”, t. 11, 2019 [online] https://repozytorium.uwb.edu.pl/jspui/bitstream/11320/9169/1/BB_11_2019_W_Maksimowicz_Tworczasc_Wasila_Bykawa.pdf
5. *Васіль Быкаў: асноўныя падзеі жыцця і дзейнасці (аглядная даведка)*, https://archives.gov.by/home/tematicheskie-razrabotki-arhivnyh-dokumentov-i-bazy-dannyh/vydayushhiesya-lichnosti/arhiўnyya-dakumenty-i-materyyaly-pra-narodnaga-pismennika-belarusi-vasilya-bykava/vasil-bykaў-asnoўnyya-padzei-zhyczczya-i-dzejnasczi-aglyadnaya-davedka [online]
6. *Васіль Быкаў. Вяртанне,* Дакументальны фільм, https://www.youtube.com/watch?v=WHWkoSbt4xA [online]


[1] В. Быкаў, *Ад зла не выратуешся, закрыўшы на яго вочы,* „Московские новости”, 1984, 14 крас.